www.gazeta.bsu.by

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

БДУ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта

14 красавіка 2005 года, № 8 (1916)

АКТУАЛЬНА

## ВАС ДЗЯРЖАВА НАВУЧАЛА, А ЦЯПЕР РАЗМЕРКАВАЛА...

***У нашым універсітэце 17 сакавіка пачалося размеркаванне выпускнікоў. А разам з ім хваляванні, радасці адных, горыч і расчараванні другіх. Як і заўжды... У БДУ вучыцца моладзь з усёй Беларусі, таму і рыхтуе альма-матэр спецыялістаў для ўсёй краіны.***





Сучасныя студэнты-старшакурснікі звычайна самі актыўна шукаюць месца будучай працы падчас вытворчай альбо творчай практыкі. Многія завязваюць неабходныя сувязі, выбіраюць і прыглядаюцца. Але калі хочаш атрымаць запыт ад заказчыка, трэба добра папрацаваць, зарэкамендаваць сябе як кваліфікаванага і працалюбівага супрацоўніка. Такія выпускнікі прыходзяць на размеркаванне з заяўкамі ад школ, рэдакцый, прадпрыемстваў.

Першай "ластаўкай" размеркавання сёлета сталі журналісты. Па спецыяльнасці "журналістыка" з 44 студэнтаў размеркаванне атрымалі 42, а з 8 журналістаў-міжнароднікаў былі размеркаваныя ўсе. А вось з 10 літаратурных рэдактараў размеркаванне атрымалі толькі 7. Столькі ж месцаў атрымалі і студэнты з аддзялення "інфармацыя і камунікацыя". Астатнія атрымалі свабоднае размеркаванне.

Ужо размеркавалі сваіх гадаванцаў на будучае месца працы камісіі юрыдычнага, гістарычнага і філалагічнага факультэтаў, а таксама факультэта журналістыкі.

Асноўным заказчыкам маладых кадраў першых трох факультэтаў выступае Міністэрства адукацыі. Па плане, у абласныя цэнтры і Мінск выпускнікі БДУ накіроўваюцца згодна з прапіскай. Студэнты, якія паступалі ў БДУ паводле мэтавага накіравання, адпраўляюцца ў аддзел адукацыі незалежна ад іх заяўкі.

Паводле закона, студэнт, які навучаецца на бюджэтнай форме, не мае права на свабоднае размеркаванне. Аднак ёсць абставіны, згодна з якімі ён не можа размяркоўвацца, — пераважна гэта сямейнае становішча.

Выпускніца філалагічнага факультэта Кацярына ўпэўнена ў свабодным размеркаванні: яна яшчэ паўгода будзе ў дэкрэтным адпачынку. А вось Наста прыйшла на размеркаванне з заяўкай ад аддзела адукацыі Мінскага раёна: у жніўні яна атрымае працу ў адной са школ. Выпускнікі з досведам працы маюць шанец знайсці месца самастойна. Калі ж досведу няма, працадаўцы не спяшаюцца прапаноўваць месца маладому спецыялісту.

**Юлія ПІМЕНАВА**
**Фотаздымкі Юліі ПАПОВАЙ**



ВЕСТКІ З ФАКУЛЬТЭТАЎ

## ЗЛУЧЫЦЬ НЕЗЛУЧАЛЬНАЕ

***Факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі 1 красавіка адзначыў сваё 35-годдзе. Юбілейная сустрэча выпускнікоў (згодна з традыцыяй яна паўтараецца кожныя 5 год) адбылася ў канцэртнай зале "Мінск".***

Павіншаваў выпускнікоў з юбілеем дэкан факультэта Павел Аляксеевіч Мандрык (таксама выпускнік ФПМІ). Падчас свайго выступлення ён узгадаў гісторыю стварэння факультэта. У 1970 г. яго пачалі ствараць 500 студэнтаў і 59 выкладчыкаў, прычым 28 з іх працягваюць працаваць і сёння (!).

Вялікая частка цырымоніі прысвячалася ўшанаванню кампаній, якія супрацоўнічаюць з факультэтам: накіроўваюць сваіх спецыялістаў чытаць пэўныя курсы студэнтам, паляпшаюць матэрыяльна-тэхнічную базу. Гэта шматлікія прадпрыемствы, якія працуюць у сферы IT-тэхналогій: асацыяцыя "Нацыянальны інфапарк", "IBA", "Dainova", "Soft", "Атлант-М" і іншыя. Кіраўнікі і многія супрацоўнікі гэтых прадпрыемстваў — выпускнікі ФПМІ. Яны казалі прыемныя і вельмі шчырыя словы ў адрас факультэта: "ФПМІ рыхтуе неардынарных спецыялістаў, якія ўмеюць злучаць незлучальнае: прастору і час, рацыяналізм і настраёвасць — умеюць мысліць творча і сістэмна".

Прыемнай навіной падзяліўся з прысутнымі Павел Аляксеевіч: трое студэнтаў V курса прымуць удзел у міжнародным чэмпіянаце свету па праграміраванні. (Яны з дэканам вылецелі ў Шанхай на наступны ж дзень пасля свята.) У мінулагоднім чэмпіянаце каманда ФПМІ заняла ганаровае III месца. Адзін з сёлетніх удзельнікаў — сын кіраўніка кампаніі "Soft". Як бачым, ФПМІ гадуе цэлыя дынастыі.

У тым, што выпускнікі факультэта злучаюць незлучальнае, мы пераканаліся падчас канцэрта: вершы і песні, якія яны выконвалі, напоўнены прафесіяналізмамі — база даных, JAVA, акно, мыш. Гледачам паказалі і ФэПээМаўскі варыянт гульні "Хто хоча стаць мільянерам?" Нават вядучы быў падобны да Максіма Галкіна — прозвішчам. Праўда, пытанні былі спецыфічныя: "Якая найвышэйшая ступень невядомага ў квадратным ураўненні?" або "Што такое асэмблер?" Павесялілі словы канферансье: "Наступны канцэртны нумар прысвячаецца аматарам тэорыі імавернасці: урэшце, хоць штосьці трэба ім прысвяціць". Яшчэ адзін нумар, які запомніўся ўсім гледачам — ФэПээМаўская "Фабрыка зорак".

Кожны выпускнік ганарыцца тым, што скончыў ФПМІ. Яшчэ раз віншуем усіх студэнтаў, выпускнікоў і выкладчыкаў гэтага факультэта!

**Ала МАЧАЛАВА**

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

**ПАДВЕДЗЕНЫ ВЫНІКІ НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ**

Стар. 2

**ШАХМАТНАЯ КАРАЛЕВА МАЕ ПРАВА НА ЛЮБЫ ХОД**



На першым курсе факультэта журналістыкі БДУ навучаецца дзяўчына, якая мае самы высокі ў Беларусі рэйтынг сярод жанчын па шахматах

Стар. 3

**НАСТУПНЫ ПРЫПЫНАК "СТУДГАРАДОК БДУ"**



8 красавіка на маршруце трамвая № 2 адбылося ўрачыстае адкрыццё прыпынку "Студэнцкі гарадок БДУ"

Стар. 4

## АБ'ЯВЫ

### АБАРОНА ДОКТАРСКІХ ДЫСЕРТАЦЫЙ

**22 красавіка 2005 года ў 10.00 у аўдыторыі 334 галоўнага корпуса адбудзецца абарона дысертацыі**

АЛЯХНО Аляксандра Рыгоравіча, дацэнта кафедры тэорыі функцый механіка-матэматычнага факультэта БДУ, на тэму "Краявыя задачы з бясконцым індэксам і некаторыя яе дадаткі" на суісканне вучонай ступені доктара фізіка-матэматычных навук.

**29 красавіка 2005 года ў 14.00 у аўдыторыі 319 корпуса фізічнага факультэта адбудзецца абарона дысертацыі**

ГАЙДУКА Пятра Іванавіча, дацэнта кафедры электронікі факультэта радыёфізікі і электронікі, на тэму "Працэсы фарміравання нізкапамерных структур у матэрыялах цвердацельнай электронікі пры іонна-промневых уздзеяннях" на суісканне вучонай ступені доктара фізіка-матэматычных навук.

**Паводле інфармацыі ўпраўлення падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі**

## ВЕДАЙ НАШЫХ!

### УЗНАГАРОДЫ ЗА ІНАВАЦЫІ

*На V Маскоўскім міжнародным салоне інавацый і інвестыцый узнагароды заваявалі13 з 14 пададзеных на конкурс навукова-тэхнічных распрацовак універсітэта. Прадукцыя БДУ атрымала два залатыя, сем срэбраных, тры бронзавыя медалі і адзін дыплом. Гэта былі адзіныя залатыя медалі, атрыманыя беларускай дэлегацыяй на салоне.*

"Залатымі" сталі для БДУ такія распрацоўкі, як "Антыгерпесны прэпарат Мазь бутамінафенавая 2%" і "Комплекс тэстаў для выяўлення наркатычных псіхатропных сродкаў". Акрамя БДУ на салоне былі прадстаўленыя распрацоўкі Міжуніверсітэцкага цэнтра маркетынгу НДР (4 экспанаты), Нацыянальнай акадэміі навук (9 экспанатаў, з якіх 8 атрымалі дыпломы), тэхнапарка БНТУ "Металіт", БДУІР, Беларуска-расійскага універсітэта, Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта. Варта адзначыць, што наш універсітэт удзельнічаў у правядзенні салона ў трэці раз.

У працы салона прымалі ўдзел прадстаўнікі расійскіх федэральных, рэгіянальных і муніцыпальных органаў улады, Сусветнай арганізацыі па ахове інтэлектуальнай уласнасці, а таксама дэлегацыі з Канады, Бельгіі, Кітая, Паўднёвай Карэі, Францыі, Украіны, Балгарыі, Польшчы, Румыніі, Эстоніі.

Апрача непасрэдна выставы, у межах салона адбыліся таксама круглыя сталы, семінары: "Інавацыйныя рэсурсы Расіі і дзяржаваў-удзельніцаў СНД", "Інфраструктура развіцця інавацыйнага прадпрымальніцтва", "Інтэлектуальная ўласнасць у мэтах інавацый: прававая ахова, абарона і выкарыстанне".

**Іван ФЕДАРОВІЧ**

## З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

# ПАДВЕДЗЕНЫ ВЫНІКІ НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

*На чарговым пасяджэнні Вучоны савет БДУ разгледзеў вынікі навукова-даследчай і навукова-інавацыйнай дзейнасці БДУ ў 2004 годзе. З дакладам выступіў першы прарэктар, прафесар С.К. Рахманаў. Ён адзначыў, што ў мінулым годзе навуковая і навукова-інавацыйная сферы універсітэта зрабілі чарговы крок наперад у сваім развіцці.*

Гэтаму паспрыяў "навуковы клімат", які склаўся ў нашай дзяржаве ў мінулым годзе і які характарызаваўся высокай стабільнасцю фінансавання навуковай сферы, інтэнсіфікацыяй абмеркавання на дзяржаўным узроўні перспектываў развіцця навукі і навукова-інавацыйнай дзейнасці, больш жорсткім падыходам з



боку дзяржавы да забеспячэння эканамічнай аддачы ад навуковай сферы краіны.

Паводле словаў С.К. Рахманава, у нашым універсітэце быў забяспечаны значны (у 1,5 раза) рост паступленняў фінансавых сродкаў у навуковую і навукова-інавацыйную сферу БДУ. У 2,5 раза павялічыўся экспарт навукова-тэхнічнай прадукцыі, атрымалі развіццё буйныя праекты (па абароне інфармацыі, біяпаліве, пенапаліурэтанах, харчовых дабаўках і інш.). У цэлым захаваны ўзровень падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі, рэалізавана прынятая на папярэднім пасяджэнні Савета сістэма матэрыяльнага стымулявання гэтага працэсу. Атрымала развіццё сістэма прасоўвання навукова-тэхнічнай прадукцыі на знешнім рынку.

БДУ і яго навуковыя ўстановы з'яўляюцца галаўнымі выканаўцамі ў 5 дзяржаўных праграмах фундаментальных даследаванняў, 11 дзяржаўных праграмах арыентаваных фундаментальных даследаванняў, 4 дзяржаўных праграмах прыкладных даследаванняў, 2 дзяржаўных праграмах "Каштоўныя металы і каштоўныя камяні на 2000—2005 гг." і "Граніт", 2 дзяржаўных навукова-тэхнічных праграмах "Хімічныя тэхналогіі і вытворчасці" (падпраграма "Малатанажная хімія") і "Новыя лекавыя сродкі" (падпраграма "Лекавыя сродкі"), 2 галіновых навукова-тэхнічных праграмах "Ствараць навучальна-навуковыя модульныя комплексы для падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне навукаёмістых, высокатэхналагічных галінаў прамысловасці Рэспублікі Беларусь" і "Забеспячэнне якасці вышэйшай адукацыі ва ўмовах пераходу да дзвюхступенчатай сістэмы".

У 2004 г. у БДУ было абаронена 75 кандыдацкіх і 7 доктарскіх дысертацый. Разам з тым, трэба адзначыць, што патрабаванні ВАКа да дысертацый становяцца ўсё больш жорсткімі.

Універсітэт выконваў 163 дагаворы ў галіне навукі і адукацыі з ВНУ і навуковымі арганізацыямі 31 краіны: Расіі (22), Германіі (18), Польшчы (18), Украіны (8), Францыі (6), а таксама Балгарыі, Іспаніі, Карэі, Нарвегіі ды інш.

Навукова-тэхнічныя распрацоўкі БДУ знаходзяць прымяненне ў сферах аховы навакольнага асяроддзя, забеспячэння якасці жыццядзейнасці чалавека, каштоўных металаў і камянёў, у сельскай гаспадарцы, рэсурса- і энергазахаванні, медыцыне, малатанажнай хіміі, геаінфармацыйных сістэмах, статыстычным прагназаванні, абароне інфармацыі, металаапрацоўцы, адукацыі, прыборабудаванні і інш.

За работу "Стварэнне і ўкараненне канкурэнтаздольных аўтаматызаваных комплексаў і тэхналагічных працэсаў вытворчасці рэсурсазберагальнай прадукцыі на аснове газанапоўненых палімераў" Дзяржаўную прэмію Рэспублікі Беларусь у галіне навукі і тэхнікі за 2004 г. атрымалі супрацоўнікі НДІ ПФП імя А.Н. Сеўчанкі БДУ М.А. Ксенафонтаў, С.А. Козел, А.С. Хатэнка, С.В. Выдумчык, Л.Я. Астроўская, А.А. Гаўрыленка.

Аднак застаецца і большасць пытанняў, пра якія гаварылася год таму: недастатковая каардынацыя даследаванняў у галіне фізікі, нездавальняючае развіццё сучасных напрамкаў біялогіі і шэрага гуманітарных навук, у тым ліку недастатковая іх арыентацыя на рэальныя патрэбы эканомікі і сацыяльнай сферы, нявырашанасць пытанняў абароны інтэлектуальнай уласнасці і ўзаемадзеяння БДУ з індывідуальнымі і калектыўнымі распрацоўшчыкамі навукова-тэхнічнай прадукцыі. Дарэчы, гэта не толькі наша бяда. У краіне ў цэлым у завершаным выглядзе дагэтуль адсутнічае адпаведная нарматыўная база.

Асноўныя напрамкі, над якімі прыдзецца працаваць БДУ ў навуковай і навукова-інавацыйнай сферах у гэтым годзе, на думку С.К. Рахманава, выглядаюць так:

пошук сродкаў на навуковыя, у тым ліку фундаментальныя даследаванні;

далейшае развіццё навукова-інавацыйнай дзейнасці, у тым ліку фарміраванне агульнага падыходу да інавацый у сучасных умовах;

далейшае пашырэнне сувязі навуковай і адукацыйнай дзейнасці;

павышэнне ўзроўню падрыхтоўкі і замацавання ва універсітэце кадраў вышэйшай кваліфікацыі;

удасканаленне матэрыяльна-тэхнічнай базы навуковых даследаванняў;

прасоўванне распрацовак БДУ (асабліва буйных) на замежныя рынкі;

распрацоўка і ўкараненне ўнутрыуніверсітэцкага механізма стымулявання аўтараў эфектыўных распрацовак;

павышэнне ўзроўню абароны інтэлектуальнай уласнасці;

павышэнне ўзроўню ўзаемадзеяння з НАНБ, ДКНТ, ВНУ краіны, ФФД;

вырашэнне праблемы прадстаўлення пазабюджэтных сродкаў пры рэалізацыі навукова-тэхнічных праектаў;

канцэптуальнае асэнсаванне ў новых умовах падыходу да даследаванняў у галіне гуманітарных навук ;

фарміраванне цэнтралізаванага фонду развіцця БДУ як неабходнай умовы фарміравання фонду развіцця навукі;

пашырэнне работы па перападрыхтоўцы кадраў на платнай аснове (навука плюс адукацыя);

сістэматызацыя і развіццё дзейнасці ў галіне навукова-метадычнага забеспячэння навучальнага працэсу.

**Падрыхтаваў**
**Іван ФЕДАРОВІЧ**

**Ад рэдакцыі:** Больш падрабязна пра асноўныя вынікі навукова-даследчай дзейнасці БДУ за 2004 год чытайце на сайце газеты **www.gazeta.bsu.by**

# РАШЭННЕ

## Вучонага савета БДУ па выніках справаздачы аб навукова-даследчай і навукова-інавацыйнай дзейнасці ў 2004 г.

**Заслухаўшы і абмеркаваўшы даклад першага прарэктара доктара хімічных навук Рахманава С.К., Вучоны савет адзначае, што ў 2004 годзе захоўваецца пазітыўная дынаміка развіцця навуковай і навукова-інавацыйнай сферы БДУ:**

застаецца на стабільна высокім узроўні плённасць НДДКР, якія выконваюцца ў рамках усіх відаў праграм і праектаў;

узмоцнена арыентацыя на праграмна-мэтавы падыход у арганізацыі навуковых даследаванняў; істотна ўзрасла доля фінансавання са сродкаў рэспубліканскага бюджэту заданняў дзяржаўных праграм фундаментальных, арыентаваных фундаментальных і прыкладных навуковых даследаванняў;

развіваюцца сувязі з навуковымі ўстановамі НАН Беларусі; вядзецца сумесная праца па фарміраванні праекта Пераліку дзяржаўных праграм фундаментальных і прыкладных даследаванняў на 2006—2010 гг.;

у рамках рэалізацыі праграмы развіцця БДУ ў частцы ўзаемадзеяння Белдзяржуніверсітэта з класічнымі і педагагічнымі універсітэтамі рэспублікі каардынатарамі ўсіх тыпаў дзяржаўных і міжвузаўскіх праграм зробленыя намаганні па ўмацаванні сувязяў з рэгіянальнымі навуковымі ўстановамі, забяспечана больш шырокае прыцягненне прадстаўнікоў рэгіянальных ВНУ да выканання праграмаў і праектаў, у якіх БДУ і яго навуковыя ўстановы з'яўляюцца галаўнымі выканаўцамі;

павышаецца ўзровень забяспечанасці кадрамі вышэйшай кваліфікацыі навуковых падраздзяленняў, захоўваюцца вядучыя ў краіне пазіцыі па эфектыўнасці аспірантуры;

расце значнасць БДУ як навукова-інавацыйнага цэнтра ўнутры краіны і на міжнародным рынку: аб'ём выпушчанай прадукцыі ўзрос у параўнанні з 2003 г. у 1,5 раза, у 2,75 раза ў параўнанні з 2003 г. выраслі валютныя паступленні за кошт рэалізацыі кантрактаў на стварэнне і перадачу навукова-тэхнічнай прадукцыі з замежнымі партнёрамі.

**У той самы час актывізацыя патрэбная на наступных напрамках дзейнасці:**

удзел падраздзяленняў БДУ ў фарміраванні дзяржаўных праграм фундаментальных і прыкладных даследаванняў на 2006—2010 гг., узаемадзеянне з галаўнымі з боку Акадэміі навук інстытутамі па праграмах, якія фарміруюцца на будучую пяцігодку, па надзяленні БДУ функцыямі галаўной арганізацыі-выканаўцы шэрага праграмаў;

уключэнне праектаў заданняў БДУ ў дзяржаўныя навукова-тэхнічныя праграмы, якія фарміруюцца на 2006—2010 гг., фарміраванне праектаў галіновых навукова-тэхнічных праграмаў і інавацыйных праектаў на наступную пяцігодку;

прыцягненне навуковых калектываў і асобных навукоўцаў (прадстаўнікоў рэгіянальнай навукі) да ўдзелу ў выкананні заданняў праграмаў і праектаў, па якіх БДУ і яго навуковыя падраздзяленні з'яўляюцца галаўнымі выканаўцамі;

прыцягненне пазабюджэтных сродкаў для выканання заданняў дзяржаўных праграмаў прыкладных даследаванняў;

камерцыялізацыя вынікаў НДДКР і ўвядзенне ў гаспадарчае абарачэнне аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці; актывізацыя патэнтна-ліцэнзійнай дзейнасці;

падрыхтоўка кадраў вышэйшай кваліфікацыі для патрэбаў універсітэта.

**У сувязі з вышэйпададзеным Вучоны савет універсітэта пастанаўляе:**

1. Ухваліць асноўныя вынікі навуковай і навукова-інавацыйнай дзейнасці БДУ за 2004 год.

2. Кіраўнікам Галоўнага ўпраўлення планавання, бухгалтарскага ўліку і фінансаў, Галоўнага ўпраўлення навукі і ўпраўлення прававой работы дапрацаваць і падрыхтаваць для зацвярджэння Палажэнне аб фондзе развіцця БДУ. Тэрмін — чэрвень 2005 г.

3. Галоўнаму ўпраўленню навукі, кіраўнікам структурных падраздзяленняў, каардынатарам усіх тыпаў дзяржаўных і міжвузаўскіх праграмаў, якія фарміруюцца на 2006—2010 гг., прыняць неабходныя меры па далейшым умацаванні сувязяў з рэгіянальнымі навуковымі ўстановамі. Забяспечыць прыцягненне прадстаўнікоў рэгіянальных ВНУ да выканання праграмаў і праектаў, у якіх БДУ і яго навуковыя ўстановы з'яўляюцца галаўным выканаўцам. Тэрмін — чэрвень 2005 г.

4. Галоўнаму ўпраўленню навукі павысіць эфектыўнасць падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі з пазіцый яе адраснасці. У гэтых мэтах разам з Міністэрствам адукацыі распрацаваць праграму мэтавай падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі для адукацыйнага працэсу. Тэрмін — снежань 2005 г.

5. Галоўнаму ўпраўленню планавання, бухгалтарскага ўліку і фінансаў разам з Галоўным упраўленнем навукі і ўпраўленнем прававой работы распрацаваць комплекс мер па арганізацыі ацэнкі і ўліку ўнёску ў структуру фінансавання НДДКР аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці. Тэрмін — лістапад 2005 г.

6. Кіраўніцтву Навукова-даследчай часці распрацаваць комплекс мерапрыемстваў па забеспячэнні эфектыўнай працы цэнтраў калектыўнага карыстання навуковым абсталяваннем. Тэрмін — чэрвень 2005 г.

7. Галоўнаму ўпраўленню навукі, упраўленню перспектыўнага развіцця і аналітычнай работы дапрацаваць у тэрмін і падрыхтаваць для зацвярджэння праграмы развіцця БДУ: "Навука БДУ (2004—2010 гг.)", "Праграмы развіцця інавацыйнай дзейнасці (2004—2010 гг.)", "Кадры БДУ (2004—2010 гг.)", "Праграма ўзаемадзеяння з НАН Беларусі і іншымі навуковымі ўстановамі (2004—2010 гг.)". Тэрмін — красавік 2005 г.

Кантроль за выкананнем гэтага рашэння ўскласці на першага прарэктара доктара хімічных навук С.К. Рахманава.

*3 сакавіка 2005 г.*

ПОСТФАКТУМ

## ЗА ЗДАРОВЫ ЛАД ЖЫЦЦЯ!

Сустрэча міністра спорту і турызму Ю.М. Сівакова са студэнцкім актывам БДУ, арганізаваная ўпраўленнем выхаваўчай работы з моладдзю, адбылася ў зале пасяджэнняў Вучонага савета універсітэта. Апрача студэнтаў на сустрэчы прысутнічалі рэктар БДУ В.І. Стражаў і выкладчыкі. Юрый Мікалаевіч прачытаў прысутным лекцыю, у якой закрануў шырокае кола пытанняў, якія тычацца здаровага ладу жыцця, распавёў пра паняцце "нацыянальнага здароўя". Акрамя таго, ён асвятліў сваё бачанне перспектываў турызму ў Беларусі, назваў найбольш папулярныя ў замежных турыстаў мясціны. Пасля лекцыі міністр каля гадзіны адказваў на пытанні студэнтаў і выкладчыкаў.

На сустрэчы закранaлася мноства праблем, у тым ліку і датычных спартыўнага жыцця БДУ. Для іх вырашэння Ю.М. Сівакоў паабяцаў сустрэцца з выкладчыкамі кафедры фізвыхавання БДУ.

**Юлія ПАПОВА**

## МІНІСТР УНУТРАНЫХ СПРАЎ СУСТРЭЎСЯ СА СТУДЭНТАМІ

Міністр унутраных спраў Беларусі Уладзімір Навумаў 7 красавіка наведаў БДУ. Арганізавала сустрэчу ўпраўленне выхаваўчай работы з моладдзю.

Для студэнтаў і адміністрацыі універсітэта ён прачытаў лекцыю на тэму "Дзейнасць органаў унутраных спраў па прафілактыцы негатыўных з'яў у маладзёжным асяроддзі".

Паводле словаў міністра, каля дзвюх трацін усіх злачынстваў учыняе моладзь — асобы да 30 гадоў. П'янства, наркаманія ў маладзёжным асяроддзі, гандаль людзьмі — асноўныя праблемы, якія сёння хвалююць міністра. З-за іх і адбываецца большасць злачынстваў, упэўнены міністр. Пасля даклада Уладзіміра Навумава прысутныя мелі магчымасць спытаць пра тое, што іх хвалюе ў працы МУС. Студэнты задавалі шмат пытанняў, закранаючы амаль усе аспекты міліцэйскага жыцця. Міністр даваў кампетэнтныя і падрабязныя адказы, што не магло не спадабацца студэнтам.

**Аляксандр САЛАМАХІН**

АСОБЫ

# ШАХМАТНАЯ КАРАЛЕВА МАЕ ПРАВА НА ЛЮБЫ ХОД

*На першым курсе факультэта журналістыкі БДУ навучаецца дзяўчына, якая мае самы высокі ў Беларусі рэйтынг сярод жанчын па шахматах. Гросмайстар Вольга Герасімовіч з 12 гадоў гуляе ў Вышэйшай лізе Беларусі, зараз актыўна працуе як журналіст і яшчэ знаходзіць час добра вучыцца. Пра тое, як яна усё паспявае, студэнтка расказала карэспандэнту "Беларускага універсітэта".*

**— Як пачыналася твая кар'ера і хто сыграў вырашальную ролю ў тваім выбары?**

— Гуляць у шахматы мяне навучыў тата, калі мне было 5 гадоў. Ён майстар спорту па веласпорце, але таксама добра гуляе ў шашкі і шахматы — на ўзроўні кандыдата ў майстры спорту. Сур'ёзна займалася ў СДЮШАР № 1 (вядомая мінская шахматная школа). За гэты час стала чатырохразовай чэмпіёнкай Рэспублікі Беларусь сярод дзяўчат у розных узроставых катэгорыях. Прымала ўдзел у чэмпіянатах свету і Еўропы, уваходзіла там у дзесятку лепшых. Потым перайшла ў Рэспубліканскі цэнтр алімпійскай падрыхтоўкі (тады ён яшчэ называўся Нацыянальны цэнтр шахмат), дзе зараз і займаюся. Трэніруе мяне вядомы беларускі спецыяліст Генадзь Юр'евіч Лібаў.

**— А кім марыла стаць у дзяцінстве?**

— Я пра гэта неяк не задумвалася. Проста гуляла ў шахматы, хадзіла ў школу, пастаянна ўдзельнічала ў спаборніцтвах...

**— Чаму ты выбрала менавіта журналістыку і паступіла на журфак БДУ?**

— Я не адразу пасля школы паступала ў ВНУ, а два гады прысвяціла шахматнай кар'еры: выканала нарматыў на званне гросмайстара, і толькі пасля гэтага вырашыла працягваць вучыцца. Гэтыя два гады я проста трызніла журфакам. Так атрымалася, што я напісала артыкул, яго надрукавалі. Потым другі, трэці... Мне спадабалася, і ў выніку я аказалася тут.

**— А што самае цяжкае ў шахматах?**

— Самае цяжкае — навучыцца добра гуляць. Для гэтага трэба шмат працаваць, багата часу прысвячаць шахматам. Гэта не толькі вывучэнне кніг, пастаянныя трэніроўкі, патрэбна яшчэ добрая фізічная форма. Патрэбен таксама ўдзел у міжнародных спаборніцтвах, дзе ёсць магчымасць гуляць з моцнымі сапернікамі, нечаму навучыцца ў іх. Вялікую падтрымку, у тым ліку фінансавую, часта аказвае РЦАП (за што яму вялікі дзякуй). У нашай краіне амаль не праводзяцца міжнародныя спаборніцтвы па шахматах.

**— На якія ахвяры даводзіцца ісці дзеля шахмат?**

— Вучоба, паступленне ва універсітэт, заняткі на першым курсе забіраюць шмат часу, патрэбнага для трэніровак. Але я стараюся як мага болей займацца шахматамі. І, нягледзячы ні на што, здолела атрымаць добрыя адзнакі на першай сесіі — у мяне ўсе "васьмёркі".



**— У цябе строгі рэжым дня?**

— Я б так не сказала, проста я стараюся не губляць час дарма. Напрыклад, некаторыя любяць размаўляць па тэлефоне. Для мяне такое недапушчальна.

**— А ці застаецца час на адпачынак?**

— Вельмі мала. Але калі выдаецца свабодная хвілінка, люблю схадзіць з сябрамі ў тэатр і кіно. Таксама люблю чытаць кнігі.

**— Як ты ставішся да крытыкі ў свой бок?**

— Мне падабаецца канструктыўная крытыка. Калі не проста скажуць, што згуляла дрэнна, а растлумачаць, якія менавіта памылкі дапусціла.

**— Кумір у шахматах ёсць?**

— Напэўна, ва ўсіх шахматыстаў галоўны кумір Гары Каспараў. Мне, напрыклад, яшчэ вельмі падабаецца Юдзіт Полгар. Гэта адна з трох сясцёр Полгар — самая моцная шахматыстка ў свеце. Юдзіт нават не ўдзельнічае ў жаночых спаборніцтвах, гуляе толькі з мужчынамі, таму што яна на галаву мацнейшая за ўсіх.

**— Самы шчаслівы дзень у тваім жыцці?**

— Цяжка назваць нейкі адзін такі дзень. Шмат прыемных здарэнняў можна ўспомніць: калі я стала чэмпіёнкай Беларусі сярод дзяўчат, калі атрымала званне гросмайстра, калі быў надрукаваны мой першы артыкул, калі паступіла на журфак...

**— А як аднакласнікі ставіліся да "спартыўнай зоркі"?**

— Яны мяне амаль не бачылі. Кожны год я прапускала 50 % заняткаў (напэўна, нават больш). Я адсутнічала, калі адбываліся многія школьныя падзеі. Сярод аднакласнікаў у мяне ёсць некалькі блізкіх сяброў, з якімі я сустракаюся і зараз. А наогул, у мяне вельмі шмат сяброў сярод спартсменаў.

**— Якой ты бачыш сваю будучыню?**

— Яна будзе звязана з шахматамі і журналістыкай. Што з гэтага стане прыярытэтным, я пакуль не ведаю. Напэўна, буду сумяшчаць два віды дзейнасці. Дакладна ведаю, што ехаць з Беларусі я не збіраюся. Раней я вельмі гэтага хацела, але потым перадумала: не так там і салодка, за мяжой. Там іншае грамадства, іншая культура, і сваім стаць вельмі цяжка, амаль немагчыма. Мне падабаецца на Радзіме.

Гутарыў
**Аляксандр САЛАМАХІН**

АБ'ЯВЫ

## РЭКТАРАТ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:**

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: методыкі выкладання фізікі і інфарматыкі, дынамічнай геалогіі, рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры, агульнанавуковых дысцыплін;

ПРАФЕСАРАЎ КАФЕДРАЎ: рускай мовы, агульнанавуковых дысцыплін;

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: інфарматыкі, вылічальнай матэматыкі, агульнага землязнаўства, глебазнаўства і геалогіі, фізічнай хіміі, прыкладной лінгвістыкі, тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства, сучаснай беларускай мовы, стылістыкі і літаратурнага рэдагавання, сацыяльнай камунікацыі, гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў, эканамічнай інфарматыкі і матэматычнай эканомікі, эканамічнай тэорыі, міжнароднага турызму, міжнароднага прыватнага і еўрапейскага права, міжнародных эканамічных адносін, агульнанавуковых дысцыплін, англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў;

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: лазернай фізікі і спектраскапіі, глебазнаўства і геалогіі, гісторыі беларускай мовы, класічнай філалогіі, сучаснай беларускай мовы, тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства, сацыяльнай камунікацыі, міжнародных эканамічных адносін, германскіх моў, дыпламатычнай і консульскай службы, міжнароднага прыватнага і еўрапейскага права, раманскіх моў, міжнародных адносін, педагогікі і праблем развіцця адукацыі, агульнанавуковых дысцыплін, англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў;

ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: эканамічнай геаграфіі замежных краін, замежнай літаратуры, гісторыі беларускай мовы, сучаснай беларускай мовы, прыкладной лінгвістыкі, класічнай філалогіі, нямецкага мовазнаўства, раманскага мовазнаўства, менеджменту, эканамічнай інфарматыкі і матэматычнай эканомікі, эканамічнай тэорыі, міжнароднага права, усходніх моў, міжнародных эканамічных адносін, германскіх моў, педагогікі і праблем развіцця адукацыі, агульнанавуковых дысцыплін, англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў, фізічнага выхавання і спорту;

АСІСТЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: агульнай фізікі, неарганічнай хіміі, аналітычнай хіміі, агульнага землязнаўства, глебазнаўства і геалогіі, заалогіі.

*Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

**Адрас: 220050, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5-а, БДУ, упраўленне кадраў, тэл. 209-54-36.**

## РЭКТАРАТ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасады:**

галоўнага навуковага супрацоўніка навукова-даследчай лабараторыі прыкладнога імавернаснага аналізу.

*Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

**Адрас: 220050, г. Мінск, БДУ, вул. Бабруйская, 9, навукова-даследчая частка, упраўленне кадраў, пакоі 407, 407а, тэл. 209-51-65, 209-54-25**

АБ'ЯВЫ

## ВЫБАРЫ Ў БРСМ

*II справаздачна-выбарная канферэнцыя пярвічнай арганізацыі грамадскага аб'яднання "Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі" адбудзецца 22 красавіка.*

Будуць разглядацца такія пытанні, як справаздача сакратара камітэта БРСМ БДУ М.С. Сіманюкова за 2002—2004 гг., выбары камітэта БРСМ БДУ, дэлегаванне сябровак аб'яднання на справаздачна-выбарную канферэнцыю Маскоўскага раёна г. Мінска і інш. У працы канферэнцыі прымуць удзел прадстаўнікі Мінскага гарадскога камітэта і Цэнтральнага камітэта ГА "БРСМ", Міністэрства адукацыі і адміністрацыі БДУ.

**Даведкі па тэл. 209-52-61.**

ВЕСТКІ З ФАКУЛЬТЭТАЎ

# СУСТРЭЧА З МІНІСТРАМ АДУКАЦЫІ УКРАІНЫ

БДУ заўжды славіўся міжнароднымі сувязямі. Польшча, Украіна, Балгарыя не толькі самыя родныя і блізкія нам суседзі, але і актыўныя навуковыя кампаньёны. Студэнты славянскага аддзялення маюць магчымасць вучыцца па падручніках з краін, мовы якіх яны вывучаюць, стажыравацца ў замежжы, а таксама атрымоўваць веды ад замежных лектараў.

Нярэдка на філалагічны факультэт завітваюць і высокапастаўленыя госці — паслы і міністры замежных краін.

Так, 6 красавіка 2005 г. адбылася сустрэча з міністрам адукацыі Украіны Станіславам Мікалаевічам Ніколаенкам. У склад дэлегацыі ўваходзілі таксама рэктар Кіеўскага політэхнічнага інстытута Міхаіл Заварoўскі і рэктар Нацыянальнага эканамічнага універсітэта Анатоль Мазаракій.

Асноўнае пытанне, якое абмяркоўвалі студэнты з міністрам, — дапамога ў навучальным працэсе, якую яны могуць атрымаць ад Украіны. Госці абяцалі даслаць слоўнікі і падручнікі, падумаць аб пераводзе на працу ў БДУ ўкраінскага лектара, запрасілі нашых студэнтаў на стажыроўку і паабяцалі падарыць камп'ютар.

У размове з міністрам мы ўдакладнілі некаторыя пытанні:

**— З якой мэтай Вы наведалі Беларусь?**

— Мы прыехалі на форум, які падрыхтавалі Выканкам СНД і ЮНЕСКА. На ім абмяркоўваліся якасць і даступнасць адукацыі ў СНД, шляхі яе ўдасканалення. Размова вялася і пра супрацоўніцтва ў межах Балонскага працэсу і еўрапейскай адукацыйнай прасторы, а таксама пра тое, як сёння ўдасканаліць дашкольную, пачатковую і вышэйшую адукацыю. Адзін з такіх шляхоў — супрацоўніцтва культураў, абмен вопытам. У БДУ мы пабачылі студэнтаў з Беларусі, якія вывучаюць украінскую мову, у суседняй аўдыторыі — групу моладзі, якая прыехала са Львова і вывучае беларускую мову. Гэта вельмі карысна: славянскія народы абменьваюцца інфармацыяй. Паглядзім, чым яшчэ можна дапамагчы: тэхнікай, падручнікамі, метадычнай і навуковай літаратурай, слоўнікамі. У першую чаргу дапаможам калегам са стажыроўкай ва Украіне.

**— Як Вы ставіцеся да сістэмы вышэйшай адукацыі ў Беларусі?**

— Я міністрам стаў не так даўно і дэталёва гэтае пытанне не вывучаў. Але наколькі я праінфармаваны, у 10 украінскіх універсітэтаў ёсць плённыя сувязі з беларускімі ВНУ. Якасць даволі высокая: шмат захавана, і многае ўзята на ўзбраенне. Мы лічым, што такія ўстановы, як БДУ і БНТУ, маюць дастаткова высокі ўзровень і могуць канкураваць у шэрагу спецыяльнасцей з еўрапейскімі ВНУ.

**Таццяна КАСЦЮКЕВІЧ,**
**студэнтка філфака**

## КНІЖНАЯ ПАЛІЦА

# КНІГА-ДЫПЛАМАНТ

*Падведзены вынікі XLV Рэспубліканскага конкурсу "Мастацтва кнігі — 2005", які праводзіла Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь.*




Сярод кніг-дыпламантаў значыцца і выданне БДУ — манаграфія "Вішчынскі замак XII—XIII стст." Аўтар кнігі — вядомы навуковец, прафесар Эдуард Міхайлавіч Загарульскі. Свой твор ён прысвяціў студэнтам гістарычнага факультэта БДУ, удзельнікам археалагічных раскопак Вішчынскага гарадзішча — тым, хто ў ліку першых адчуў радасць надзвычайных адкрыццяў.

На старонках кнігі знайшоў адлюстраванне багаты матэрыял пра унікальны гістарычны помнік на тэрыторыі Беларусі — баярскі палац-замак XII—XIII стст., дзе на працягу 10 гадоў праводзіла раскопкі археалагічная экспедыцыя БДУ. Асобная глава прысвячаецца знойдзенаму на месцы раскопак скарбу сярэбраных грашовых зліткаў і ўпрыгожанняў — шэдэўраў ювелірнага




майстэрства, пра што і сведчаць каляровыя ілюстрацыі.

Выданне гэтай кнігі — вялікі поспех, здабыты як намаганнямі аўтара і калектыву выдавецтва, так і майстэрствам работнікаў друкарні. Атрыманы дыплом — доўгачаканая высокая адзнака выдаўцу ў асобе Беларускага дзяржаўнага універсітэта і добры наказ на будучыню — стараць яшчэ больш дасканалыя, прыгожыя і карысныя кнігі.

**Упраўленне рэдакцыйна-выдавецкай работы БДУ**

## НАВІНЫ СТУДГАРАДКА

# ШКОЛА СТУДЭНЦКАГА АКТЫВУ

*З 8 па 10 красавіка на базе САК "Брыганціна" прайшоў чарговы выязны семінар-практыкум "Школа студэнцкага актыву". Галоўная мэта семінара — павышэнне якасці і плённасці работы ўсёй інфраструктуры студгарадка, прэзентацыя новых сацыяльных праектаў студэнцкіх саветаў.*

Праграма семінара атрымалася надзвычай насычанай. Мерапрыемства пачалося ўрачыстым адкрыццём у Мінску трамвайнага прыпынку "Студэнцкі гарадок". А ў "Брыганціне" ўдзельнікаў семінара ўжо чакалі псіхалагічная гасцёўня, якую традыцыйна праводзіць начальнік псіхалагічнай службы студгарадка Руслан Пятровіч Папок, фотавыстава "Дзень за днём" і вечар аўтарскай песні.

Другі дзень семінара прапанаваў удзельнікам сур'ёзную работу па секцыях. Адкрылі семінар прарэктар па вучэбна-выхаваўчай працы і сацыяльных пытаннях В.В. Сувораў, дэпутат камісіі па дзяржаўнай маладзёжнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі І.В. Карпенка, начальнік аддзела па справах моладзі Мінскага гарвыканкама В.П. Брэль. Адбылася таксама сустрэча студэнтаў з В.І. Стражавым, на якой рэктар БДУ акрэсліў найбольш важныя праблемы развіцця універсітэта і шляхі іх вырашэння.

Студэнцкаму активу была прапанавана работа па 6 секцыях: секцыя для праваых камісій і сакратароў студэнцкіх саветаў, для жыллёва-бытавых камісій, для культурна-масавых, для інфармацыйных камісій студсаветаў і грамадскай інфармацыйнай службы, для старшынь і намеснікаў старшынь студсаветаў, для спартыўных камісій і студэнцкага спартыўна-турысцкага клуба.

Працоўны дзень скончыўся для ўдзельнікаў семінара творчай праграмай "Студэнцкі гарадок прапануе..." і дыскатэкай.

У апошні дзень выязнога семінара-практыкуму прайшлі спартыўныя мерапрыемствы, прэзентацыя маладзёжных сацыяльных праектаў студсаветаў. Ахвотна прынялі ўдзел у праекце "Працоўны дэсант". Таксама былі падведзены вынікі і прынятa рэкамендацыя па выніках работы семінара.

**Сняжана ЛІСОЎСКАЯ**

## ПАДЗЕІ

# НАСТУПНЫ ПРЫПЫНАК "СТУДГАРАДОК БДУ"

*8 красавіка на маршруце трамвая № 2 адбылося ўрачыстае адкрыццё прыпынку "Студэнцкі гарадок БДУ", які дагэтуль насіў назву "Лазенна-пральны камбінат".*

Камбіната даўно ўжо няма, затое менавіта ў гэтым раёне Мінска зусім блізка адзін да другога размясціліся інтэрнаты Беларускага дзяржаўнага універсітэта № 2, № 5, № 6 і № 7 — сапраўдны студэнцкі гарадок, і цяжка не пагадзіцца, што новая назва больш адпавядае рэчаіснасці.

Дзякуючы ініцыятыве студгарадка і пры дапамозе адміністрацыі Ленінскага раёна прыпынак "Студгарадок БДУ" стаў, такім чынам, ужо чацвёртым пунктам на маршрутнай карце сталіцы, звязаным з імем нашага універсітэта: ужо ёсць аўтобусныя прыпынкі "Філіял БДУ" і "Факультэт радыёфізікі і электронікі", а таксама трамвайны прыпынак "Ліцэй БДУ".





На адкрыцці прыпынку прысутнічалі рэктар нашага універсітэта В.І. Стражаў, прарэктар па вучэбна-выхаваўчай працы і сацыяльных пытаннях В.В. Сувораў, дырэктар студэнцкага гарадка БДУ М.Б. - Чарапеннікаў, начальнік аддзела па справах моладзі Ленінскага раёна І.В. Буланава і намеснік дырэктара трамвайнага дэпо па эксплуатацыі А.В. Лапко.

Традыцыйную чырвоную стужку перарэзаў урачыста ўпрыгожаны трамвай са сцягам БДУ, на якім усе жадаючых маглі пракаціцца бясплатна — з нагоды свята.

**Сняжана ЛІСОЎСКАЯ**
**Фотаздымкі аўтара**

## ВЕСТКІ З ФАКУЛЬТЭТАЎ

# ПАЖАРТАВАЛІ...

*Першага красавіка заўсёды чакаеш сюрпрызаў і незвычайных гісторый. Але сапраўдный нечаканасцю для студэнтаў геаграфічнага факультэта стала сустрэча з рэдакцыяй часопіса "Вожык", якая адбылася ў нас якраз падчас свята гумару.*

"Вожык" — адзіны прафесійны часопіс сатыры і гумару ў Беларусі. Яшчэ ў 1941 г. з'явіўся плакат "Задавім фашысцкую гадзіну", каб гумарам падтрымаць маральны стан салдат у цяжкія часы вайны. У 1944 г. адбылося пасяджэнне пад кіраўніцтвам Кандрата Крапівы, дзе было вырашана ператтварыць плакат у паўнацэнны часопіс сатыры і гумару. Крапіва прапанаваў назваць часопіс "Вожык", бо гэта адзіная жывёла на Беларусі, якая сапраўды давіць гадаў.

І вось да нас на геафак завіталі госці з "Вожыка". Сустрэча была арганізавана аддзелам гуманітарна-асветніцкай работы ФБ БДУ. Умела вяла размову Ірына Сцяпанаўна Шкіронак, якая жартавала і задавала цікавыя пытанні. Павел Саковіч і Анатоль Зэкаў павесялілі нас жартамі, цікавымі і смешнымі выпадкамі са свайго жыцця. Павел Саковіч — паэт, парадыст, сатырык, першы лаўрэат літаратурнай прэміі імя Кандрата Крапівы, заснаванай часопісам "Вожык". Гэта адзіная прэмія ў галіне сатыры і гумару ў Беларусі. Анатоль Зэкаў — паэт, парадыст, сатырык, рэдактар аддзела "Вожыка". Госці прэзэнтавалі фундаментальнай бібліятэцы БДУ свае кнігі.

У свята гумару было прыемна сустрэцца з такімі цікавымі і таленавітымі людзьмі, якія павесялілі нас добрымі жартамі, сатырычнымі і парадыйнымі вершамі. У гэты цудоўны дзень нават дэкан факультэта Іван Іванавіч Пірожнік не ўтрымаўся і расказаў вясёлую гісторыю са студэнцкага жыцця.

Хочацца, каб такія сустрэчы часцей праходзілі на факультэце, бо дзякуючы ім вучоба становіцца весялейшай і цікавейшай.

**Людміла ГРЭСЬ,**
**Юлія БОГДАН,**
**студэнткі**
**геаграфічнага факультэта**

## У ВОЛЬНЫ ЧАС

# КАПЭЛА ЗАСТАЕЦЦА "НАРОДНАЙ"

Народная харавая капэла БДУ 9 красавіка пацвердзіла сваё званне. Калектыў, заснаваны амаль 60 год таму, атрымаў новае жыццё з прыходам у верасні 2004 г. маладога кіраўніка — дырыжора Аляксандра Мінянкова. Прысутных на конкурсе ўразіла разнастайнасць праграмы: гучалі праваслаўныя псалмы, народныя песні, амерыканскія спірычуэлсы і творы сучасных кампазітараў. Здзівілі разнастайнасць складу капэлы: разам з беларусамі ў яе ўваходзяць прадстаўнікі Нігерыі і Аўстрыі.

Праз працэдуру пацверджання звання калектывы праходзяць кожныя 3 гады. Да конкурсу-праслухоўвання рыхтуюць новыя праграмы, касцюмы: трэба прадставіць новы ўзровень, што калектывы здолелі дасягнуць за трохгадовы тэрмін. Сёлета ў сваім прафесіяналізме і высокім выканаўчым узроўні пераконвалі калектывы: народны аркестр народных інструментаў (лаўрэаты фестывалю народнай творчасці "Сузор'е"), народны хор выкладчыкаў і супрацоўнікаў БДУ "Родніца" (дыплом 3-й ступені), народны фальклорны ансамбль "Тутэйшая шляхта" (дыплом 3-й ступені), народны фальклорна-этнаграфічны ансамбль "Неруш" (лаўрэаты), народны ансамбль танца «Крыжачок», узорны дзіцячы ансамбль танца "Літарынка". У рамках І Міжнароднага тэатральнага фестывалю "Куфар" паказалі сваю праграму два тэатры БДУ. Вынікі гэтага выступлення пакуль што невядомыя, але абодва калектывы атрымалі высокія адзнакі журы.

**Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ**

## ПОСТФАКТУМ

# РАСПАЧАЛІ СЕЗОН

Першыя гульні новага сезона Адкрытай лігі КВЗ БДУ адбыліся 6—7 красавіка. За 4 пуцёўкі ў чвэрцьфінал змагаліся 12 каманд. Упершыню ў гульнях удзельнічалі прадстаўнікі не факультэта, універсітэта ці горада, а грамадскага аб'яднання. "Пістоны" з БРСМ БДУ былі прынятыя з асаблівай сапікаўленнасцю, як і дэбютанты Лігі — каманды "Ку-ку" (гімназія № 174), "Аранжавы экстаз" (хімічны факультэт) і інш.

Чвэрцьфінал пройдзе зноў у актавай зале філалагічнага факультэта. 18—19 мая здзіўляць гледачоў і прымушаць нас смяяцца будуць каманды "Баракуда" (БДТУ), "Знаёмыя твары" (БДЭУ), "Пістоны", незалежныя каманды "Хнуся" і "Асы", "Дзевяць з паловаю" (СШ № 161), "Дзесьці побач" (зборная ФФСН і ваеннага факультэта) і чэмпіёны мінулага года — зборная геаграфічнага факультэта БДУ.

**Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ**

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты — Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 28 чэрвеня 1996 года

14 красавіка 2005 года
Падпісана да друку 13.04.2005 г.
Зак.363. Тыраж 1000 экз. Ум. друк. арк. 1
Надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ" 220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Таццяна КАЗАК
Адрас рэдакцыі: 220050, Мінск, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 7, пакой 411, тэлефон 209-53-45,
e-mail: Gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by